**Людміла ШКЛЁДА**

***

Святая зямелька – Палескі мой край!
Шмат зорак на небе: чыя дзе, парай.
Вось цуда дык цуда – якая ж ярчэй?!
А я пазіраю, не зводжу вачэй.

Казалі мне людзі, між іншым, чый лёс
Узнёс так Радзіму сваю да нябёс.
Хто словам і справай праславіў яе,
Нясе тым прызнанне ў каханні свае.

Ды рэхам аднойчы ўсё адгукнецца:
Матуля сыночку свайму ўсміхнецца.
Сустрэне край родны, хата і ганак,
Цудоўны вясковы сонечны ранак.

Як некалі, тут гучыць родная мова.
Цікавай, вядома, будзе размова.
Пасля ўспаміны нахлынуць, магчыма,
І школа з дзяцінствам – перад вачыма.

Ды толькі ён госцем будзе нядоўга.
Яго, як заўсёды, кліча дарога.
Лёс, пэўна, у кожнага свой, так бывае,
Але край ён родны не забывае.

«Табой ганарымся!» – чуе ўздагонку:
«Бо шчыра ты, сэрцам любіш старонку,
Радзіму, вядома, не выбіраем,
Бацькоўскую хату лічыш ты раем!»

Хай помняць нашчадкі наша Палессе:
Жаўронка над полем, зязюлю ў лесе,
Бусліны клёкат над бацькавай хатай,
Любоў сваіх родных –
матчыну з татавай!